**Булыня Леонид Николаевич**

[У час праходжання тэрміновай службы ва Узброеных Сілах Леанід Булыня знаходзіўся ў Афганістане] // Голас Сенненшчыны. — 2005. — 15 лют. — С. 1.



У час праходжання тэрміновай службы ва Узброеных Сілах Леанід Булыня знаходзіўся ў Афганістане, дзе разам з многімі нашымі землякамі спрабаваў прымірыць варагуючыя бакі чужой краіны – не атрымалася. Але яму пашанцавала. Ён вярнуўся ў роднае Сянно, у будаўнічую арганізацыю, дзе пачынаў працоўны шлях, і якая тады называлася ПМК-10. Днямі прадпрыемства адзначае юбілей. УП «Сяннобудмеліяводгас» спаўняецца 25 гадоў з часу яго заснавання. Разам з прадпрыемствам юбілярам смела можна назваць і Л. Булыню. У яго такі ж працоўны стаж. Прычым, Леанід ні ў якай іншай арганізацыі не працаваў. Мяняў толькі прафесіі: экскаватаршчык, вадзіцель аўтамашыны, трактарыст, цясляр. У апошнія гады ён узначальвае адну з будаўнічых брыгад.

На здымку: Леанід Булыня